На рынках, у дробнарознічных аб'ектах гандлю Мінска і абласных цэнтраў была канфіскавана буйная партыя растваральнай кавы з яўнымі прыкметамі падробкі.

СТАР 2

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

30 КАНАЛАЎ

Адной з самых цяжкіх інфекцый дзіцячага ўзросту з'яўляецца менінгакокавая інфекцыя. Пачатковыя праявы захворвання нагадваюць прастуду або грып. Хвароба можа развівацца ў лічаныя хвіліны...

СТАР 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 СТУДЗЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 15 (27380) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НОВЫЯ НАПРАМКІ Ў АБАРОННЫМ СЕКТАРЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка патрабуе больш актыўна развіваць новыя напрамкі ў абаронным сектары эканомікі і ствараць запатрабаванае на сусветным рынку ўзбраенне. Аб гэтым ён заявіў учора на нарадзе па пытаннях развіцця ваенна-прамысловага комплексу краіны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Размова пойдзе аб бяспецы нашай дзяржавы, нашай арміі і яе ўзбраенні, — сказаў кіраўнік дзяржавы, адкрываючы нараду. — Абаронны сектар эканомікі заўсёды з'яўляўся флагманам перадавых тэхналогій і інавацый. Толькі самае надзейнае і лепшае запатрабавана ва ўсіх арміях. І тут нам ні ў якім разе нельга адставаць».

Як адзначыў Прэзідэнт, беларускія абаронныя прадпрыемствы выпускаюць даволі шырокую лінейку ўзбраенняў. Пастаянным попытам у розных краінах карыстаюцца комплексы кіравання войскамі і зброяй, сістэмы абароны ад высокадакладнай зброі, радыёлакацыйныя станцыі, сродкі ППА. Сёння больш як 70 працэнтаў прадукцыі беларускага ВПК ідзе на знешні рынак. А тэхніка такіх прадпрыемстваў, як «Пеленг», МЗКЦ, «Тэтраэдр», практычна ў поўным складзе рэалізуецца замежным заказчыкам. «Нам удалося пераадолець сітуацыю, калі ў структуры экспарту пераважала савецкая тэхніка, не патрэбная ва Узброеных Сілах. Цяпер амаль 90 працэнтаў экспартуемага ўзбраення і паслуг — беларускія. Такую пазітыўную дынаміку трэба замацоўваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы пры гэтым заўважыў, што канкурэнцыя на сучасным рынку ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі выключна высокая: «Таму мы павінны аператыўна знаходзіць і сістэмна развіваць новыя напрамкі. Выкарыстоўваючы свой патэнцыял, механізмы ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, ствараць сучасныя ўзоры ўзбраення, запатрабаваныя ў нашай арміі і на сусветным рынку, — лічыць Прэзідэнт. — Выгада тут відавочная. Мадэрнізацыя прадпрыемстваў ВПК, увод новых вытворчасцяў — гэта пляцоўка для атрымання і ўкаранення перспектыўных тэхналогій. У далейшым яны дадуць штуршок інавацыйнаму развіццю іншых галін эканомікі і ўмацаванню нашых пазіцый на сусветным рынку. А ў канчатковым выніку — узмоцняць абараназдольнасць краіны, павялічаць фінансавыя паступленні ў дзяржаўны бюджэт».

Прэзідэнт нагадаў, што задача па стварэнні новых вытворчасцяў і сучасных сістэм узбраення ім была пастаўлена даволі даўно. «Таму сёння хацеў бы пачуць, якія распрацоўкі цяпер вядуцца і што мы ў бліжэйшай перспектыве плануем ствараць, якія напрамкі гэтай дзейнасці мы будзем развіваць», — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады Аляксандр Лукашэнка.

«Ніякіх шалёных грошай, гэтак жа як і на дрэваапрацоўку, кандытарскія і іншыя тавары, мы выдзяляць не маем намеру. Толькі канкрэтны праект, тэрміны і абавязкова запатрабаванасць як на ўнутраным, так і на знешнім рынку. Калі нам хочацца, але мы не можам гэта рабіць, то і размовы аб гэтым быць не можа», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

НА ШТО ЗДОЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА?

Фота Надзеі БУЖАН.

Стыпендыят Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі, 26-гадовы бацька дваіх дзяцей і выдатны біяхімік — усё гэта адзін чалавек. Зараз Дзмітрый МУХА працуе ў Інстытуце біяарганічнай хіміі НАН Беларусі. Менавіта да яго мы завіталі напярэдадні Дня навукі, каб пагаварыць пра новае пакаленне беларускіх навукоўцаў і перспектывы айчыннай навукі ўвогуле.

Мы сустрэліся з Дзмітрыем напрыканцы працоўнага дня. І ён адразу ж развеяў нашы стэрэатыпы наконт выгляду вучонага. Яго працоўнае месца — стол з камп'ютарам. Пабачыўшы здзіўленне ў нашых вачах, Дзмітрый усміхаецца: «Я спецыяліст у біяінфарматыцы. Тут звычайна і працую».

— Дзмітрый, ці памятаеце вы, як вырашылі стаць вучоным?

— Безумоўна, памятаю. Гэта было вельмі даўно, яшчэ ў школе. Мне былі цікавыя ўсе навукі, падручнікі я гартаў наперад яшчэ да пачатку навучальнага года. Трохі пазней мне стала асабліва падабацца хімія. Тады я і зразумеў, што ўсё цікавае для мяне сканцэнтравана ў сферы навукі. Акрамя таго, мой бацька таксама навуковец — працаваў у Інстытуце матэматыкі. Дарэчы, бацькі падтрымалі б любы мой выбар наконт уласнай будучыні і прафесіі, нават нягледзячы на шматлікія негатыўныя стэрэатыпы пра навуковую працу. Школу я скончыў з залатым медалём, перамог у адной з рэспубліканскіх алімпіяд і паступіў на біяфак БДУ без уступных іспытаў.

— Ці задаволіла вас навучанне на біяфаку? Ці даводзілася займацца самаадукацыяй?

— Па-першае, студэнцтва ўвогуле не можа не падабацца. А па-другое, біяфак аказаўся для мяне, напэўна, лепшым месцам. Там было сапраўды цікава. Наконт самаадукацыі трэба сказаць, што самі выкладчыкі падштурхоўвалі нас да таго, каб мы вучыліся шукаць тое, што нам трэба. Існуюць, напрыклад, вялізныя базы даных па навуковых працах, якіх мільёны. Мы практыкаваліся ў пошуку патрэбнай інфармацыі ў такой вялізнай яе масе. Гаворачы пра вучобу, я бачу толькі адзіны мінус: на біяфак вельмі часта трапляюць людзі выпадковыя. Звычайна яны потым працуюць у сферы, не звязанай са сваёй спецыяльнасцю.

— Вы былі выдатнікам і ва ўніверсітэце?

— Дарэчы, не. Гэта было звязана с асабістым жыццём (на пятым курсе я ажаніўся), пачаў жыць асобна ад бацькоў. Даводзілася працаваць. Пайшоў выкладаць біялогію ў сярэдняй школе. Ад гэтага досведу засталіся толькі добрыя ўспаміны. З вучнямі ў мяне была зусім малая розніца ва ўзросце, мы добра адно аднаго разумелі. Хаця, безумоўна, сутыкаўся я і з тыповымі настаўніцкімі праблемамі. Але цяпер, калі выпадкова сустракаю былых вучняў, яны вітаюцца, цікавяцца, як маё жыццё. Таму, калі мае сакурснікі вырашалі ўсе пытанні з адзнакамі, я быў заняты іншым. Але ні ў якім разе не шкадую.

— А зараз на што хапае часу?

— Толькі на працу. Жонка, вядома, крыўдзіцца, але ўсё разумее. Працоўны дзень у нас пачынаецца з 8:30 і завяршаецца ў 18:00. Аднак звычайна ўсе прыходзяць раней. І вельмі рэдка хтосьці заканчвае працаваць а шостай. Гэтак кожны дзень. Калі будзеш працаваць інакш — нічога не паспееш. На выхадных у інстытуце таксама шмат людзей. Не магу сказаць, каб мне гэта не падабалася.

— Давайце пяройдзем да вашай працы. Над чым зараз працуеце, калі не сакрэт?

— Увогуле — гэта шматбаковае вывучэнне малекулярных асноў жыцця, калі казаць максімальна проста і коратка. Яе практычным вынікам можа стаць, напрыклад, з'яўленне новага прэпарата для лячэння пэўных хвароб. Напрыклад, зараз мы займаемся вывучэннем уздзеяння некаторых рэчываў на грыбковыя інфекцыі. На жаль, многія прэпараты ўжо састарэлі, інфекцыі на іх не рэагуюць зусім альбо рэагуюць, але не ва ўсіх хворых. Асабліва ў тых, што аслаблены іншымі захворваннямі.

СТАР 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Барыс БАТУРА: старшыня Мінаблвыканкама:

«Неабходна актывізаваць працу па стварэнні добраахвотных пажарных каманд. Пры гэтым важна правільна разумець сэнс добраахвотнай пажарнай каманды, для яе стварэння не патрэбны вялікія сродкі. Гэта добраахвотнікі, якія інфармуюць насельніцтва аб правілах супрацьпажарнай бяспекі, наведваючы жыхароў у іх дамах. Акрамя таго, задачай такіх каманд з'яўляецца выезд на пажар для яго стрымлівання да прыбыцця пажарных падраздзяленняў. Добраахвотныя пажарныя каманды павінны быць арганізаваны не толькі на прадпрыемствах, але і ў вёсках, з прыцягненнем моладзі».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 10°
Віцебск	– 11°
Гомель	– 6°
Гродна	– 11°
Магілёў	– 10°
Мінск	– 10°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.01.2013 г.

Долар ЗША	8630,00	▼
Еўра	11510,00	▲
Рас. руб.	286,00	■
Укр. грыўня	1062,15	▼

ПРЭЗІДЭНТ ЗААХВОЦІЎ ХАКЕІСТАЎ

Аляксандр Лукашэнка ўручыў спецыяльныя лісты аб аб'яўленні падзякі ігракам хакейнай каманды Прэзідэнта Беларусі за паспяховае выступленне на дзявятым Калядным міжнародным турніры аматараў хакея на прыз кіраўніка дзяржавы: Дзмітрыю Баскаву, Леаніду Грышукевічу, Вячаславу Лісічкіну, Паўлу Мікульчыку, Арцёму Сянькевічу, Сяргею Стасю, Аляксею Страхаву. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы таксама заахвоціў каштоўнымі падарункамі хакеістаў і трэнерскі штаб каманды.

■ Прамая лінія

АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ЖЫЛЛЁВАЙ ПАЛІТЫКІ

1 лютага, у пятніцу, з 11.00 да 13.00 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандра Вітальевіча ГОРВАЛЯ. Начальнік упраўлення адкажа на пытанні рэгулявання сістэмы пастаноўкі на ўлік грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, пра новыя механізмы дзяржаўнай падтрымкі ў жыллёвым будаўніцтве, пра будаўніцтва жылля па дзяржзаказе і арэнднага жылля, а таксама на іншыя актуальныя пытанні жыллёвай палітыкі.

Нумары «прамой лініі»: **8 (017) 292 38 92, 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна дасылаць на электронны адрас: zvarot@zvyazda.minsk.by.

ДЭКЛАРАВАННЕ ДАХОДАЎ І ІНШЫЯ ПЫТАННІ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

На пытанні, звязаныя з аплатай падаходнага падатку, падчас «прамой лініі» чытачам нашага выдання адкажа **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана Аляксандраўна ШАЎЧЭНКА.**

«Прамая лінія» адбудзецца 31 студзеня, у чацвер, з 11.00 да 12.00 у рэдакцыі «Звязды».

Нумары «прамой лініі»: **8 (017) 292 38 92, 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна дасылаць на электронны адрас: zvarot@zvyazda.minsk.by.

АД КОСМАСУ — ДА МЕДЫЦЫНЫ

Згодна з дакладам Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, па выніках 2012 года па колькасці заявак на вынаходніцтвы ў разліку на 1 млрд долараў валавога ўнутранага прадукту Беларусь займае 11-е месца ў свеце, а па колькасці заявак на карысныя мадэлі — 14 месца, апярэдзіўшы Польшчу, Аўстрыю, Філіпіны, Ганконг, Мексіку і Францыю. З пачатку 1990-х гадоў штогадовая колькасць унутраных патэнтных заявак узрасла ў нашай краіне ў 2,7 раза. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню беларускай навукі, паведаміў намеснік Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК:

— Мінулы год стаў знакавым не толькі для беларускай навукі, але і для ўсёй нашай краіны, паколькі Беларусь стала касмічнай дзяржавай, — адзначыў ён. — Першы беларускі касмічны апарат летам 2012 года быў паспяхова выведзены на арбіту з касмадрома «Байканур».

СТАР 2

■ Завочная прамая лінія

ПЕРАЛОМУ МОЖНА ПАЗБЕГНУЦЬ

Ці можна выявіць астэапароз на ранніх этапах? З якога моманту неабходна задумвацца аб даследаванні мінеральнай шчыльнасці коснай тканкі? Як засцерагчыся пераломаў, калі косці ўжо ломкія? На гэтыя і іншыя вашы пытанні, шаноўныя чытачы, адкажа **прафесар, доктар медыцынскіх навук, кіраўнік Мінскага гарадскога цэнтра прафілактыкі астэапарозу Эма Уладзіміраўна РУДЭНКА**.

Пытанні пакідайце, калі ласка, па рэдакцыйным нумары **8 (017) 287 18 29 да 28 студзеня**.

Адказы будуць надрукаваны на старонках газеты «Звязда».

СОНЕЧНА І МАРОЗНА

Напрыканцы тыдня на тэрыторыі Беларусі захаваецца халоднае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

У выхадныя маразы ўзмоцняцца. Чакаецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е. Уначы і раніцай слабы туман і шэрань, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература ў суботу і нядзелю ўначы мінус 17—24, месцамі да 25—28 марозу. Удзень сонечна, вецер слабы і не больш за 10—15 марозу, толькі ў асобных раёнах да мінус 17 градусаў.

У панядзелак з тэрыторыі Украіны да нас пачне паступаць няўстойлівая і вільготная павет-раная маса. Уначы на панядзелак яшчэ без ападкаў, а ўдзень ужо месцамі кароткачасовы снег. Узмацніцца паўднёва-ўсходні вецер, 3—8 м/с, месцамі парывамі да 12—14 м/с. Уначы на панядзелак мінус 12—18, пры праясненнях да 20—25 марозу. Тэмпература ўдзень ад мінус 5 па паўднёвым захадзе, да 12 марозу па ўсходзе Беларусі.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КНДР АБВЯСЦІЛА АБ НАМЕРЫ ПРАВЕСЦІ НОВЫЯ ЯДЗЕРНЫЯ ВЫПРАБАВАННІ

Паўночная Карэя правядзе трэція па ліку ядзерныя выпрабаванні ў адказ на пашырэнне санкцый ААН супраць Пхеньяна. Пра гэта 24 студзеня заявілі ў Дзяржаўным камітэце нацыянальнай абароны краіны. У заяве адзначаецца, што «розныя спадарожнікі» і ракеты далёкага дзеяння будуць скіраваны супраць «заклятага ворага» КНДР Злучаных Штатаў Амерыкі. «Звядзенне рахункаў з ЗША павінна рабіцца пры дапамозе сілы, а не пры дапамозе слоў», — гаворыцца ў заяве паўночнакарэйскіх улад. Асабліва адзначаецца, што гаворка будзе ісці аб «ядзерных выпрабаваннях высокага ўзроўню». Шэраг экспертаў лічыць, што КНДР мае намер правесці выпрабаванні ўранавай бомбы. У папярэднія разы (у 2006 і ў 2009 гадах) КНДР праводзіла выпрабаванні плутоніевых бомбаў.

У ІНДЫІ АДКРЫЎСЯ ПЕРШЫ ЖАНОЧЫ СУД

У індыйскім штаце Заходняя Бенгалія адкрыўся першы спецыялізаваны суд, у якім будуць разглядацца справы аб злачынствах, учыненых супраць жанчын. У ім суддзі, увесь персанал і дзяржаўныя адвакаты будуць жанчынамі. Прыярытэтам для гэтай установы будзе, па-першае, паскораны разгляд спраў, па-другое, канфідэнцыяльнасць. Па задуме стваральнікаў, у жаночых судах ахвярам згвалтаванняў і дамаганняў будзе прасцей распавесці аб злачынствах, учыненых супраць іх. Плануецца арганізаваць яшчэ некалькі такіх судоў.

З ФЕРМЫ ЗБЕГЛІ 15000 КРАКАДЗІЛАЎ

У Паўднёвай Афрыцы з кракадзілавай фермы збегла каля 15 тысяч яе насельнікаў. Кракадзілы апынуліся за межамі свайго жылля пасля таго, як уладальнікі гаспадаркі адкрылі загоны, каб пазбегнуць штармавога нагону вады: у цяперашні час у Лімпапо і іншых правінцыях ідуць праліўныя дажджы.

Некаторых уцекачоў удалося злавіць і вярнуць на ферму, аднак многія з іх па-ранейшаму знаходзяцца на свабодзе. Аднаго з драпежнікаў злавілі на полі для рэгбі прыкладна за 120 кіламетраў ад яго роднай гаспадаркі. Звестак аб пацярпелых ад кракадзілаў не паступала.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КАТАЛОНІЯ АБВЯСЦІЛА АБ СВАІМ СУВЕРЭНІТЭЦЕ

Парламент іспанскай правінцыі Каталонія адобрыў сімвалічную дэкларацыю суверэнітэту тэрыторыі, такім чынам адкрыўшы шлях для правядзення рэферэндуму па пытанні незалежнасці ад Іспаніі.

У падтрымку дэкларацыі прагаласавала 85 чалавек, супраць — 41. Два дэпутаты ўстрымаліся.

Незалежнасць падтрымалі кіруючы ў рэгіёне блок «Канвергенцыя і Саюз», а таксама Рэспубліканская Левая партыя. Супраць выступілі Каталонскія сацыялісты і кіруючая ва ўсёй Іспаніі Народная партыя. Дэкларацыя сама па сабе з'яўляецца сімвалічнай, аднак, як чакаецца, яна прывядзе да абвастрэння супрацьстаяння паміж Барселонай і цэнтральным урадам у Мадрыдзе. Апошні абяцаў заблакіраваць усе ініцыятывы Каталоніі ў дачыненні да незалежнасці. Апытанні грамадскай думкі паказваюць, што ў пытанні абвяшчэння незалежнасці галасы каталонцаў падзяляюцца амаль роўна напалам. У той жа час, калі суверэнітэт будзе азначаць выхад з ЕС, жыхары правінцыі не маюць намеру яго падтрымліваць.

КАРОТКА

Колькасць дзікіх жывёл у паляўнічых угоддзях Беларусі з 2005 года павялічылася на 80 працэнтаў. Даходы ад паляўнічай гаспадарчай дзейнасці павялічыліся ў 15 разоў, ад турызму з удзелам замежных грамадзян — амаль у 300 разоў. Вылаў рыбы з рыбалоўных угоддзяў узрос больш як у паўтара раза.

Па выніках дыягностыкі, для давядзення ўсіх рэспубліканскіх дарог да нарматыўных параметраў трэба адрамантаваць 6469 км дарог (у тым ліку капітальным рамонтам 2406 км). Цяпер каля 98 працэнтаў (12578 км) рэспубліканскіх аўтатрас эксплуатуюцца з пратэрмінаванымі міжрамонтнымі тэрмінамі.

Нацыянальная акадэмія навук арганізавала вытворчасць беспілотных лятальных апаратаў. Вытворчасць беспілотнікаў будзе дробнасерыйнай. У цяперашні час створана каля 10 асобнікаў. У будучыні беспілотнікі плануецца пастаўляць на рынкі іншых дзяржаў. Сярод патэнцыйных заказчыкаў — В'етнам.

ЦІ ЁСЦЬ АЛЬТЭРНАТЫВА КАМП'ЮТАРНЫМ ГУЛЬНЯМ?

Рафаіл ЦЮЦІН, вядучы спецыяліст цэнтральнага апарата ДТСААФ:

— Альтэрнатыва ёсць заўсёды. Веласпорт, велатурызм, футбол, хакей і іншыя віды спорту. Аднак трэба разумець, што гэтыя гульні патрабуюць немалых матэрыяльных выдаткаў. А гэта не ўсім бацькам па сілах. Таму і атрымліваецца, што менш затратныя для бацькоў і больш даступныя для дзяцей — камп'ютарныя гульні. І як бы сённяшнія бацькі не скардзіліся на сваіх нашчадкаў, яны добра разумеюць, што сучасныя тэхналогіі дазволілі ім не прыкладаць шмат намаганняў і грошай на тое, каб іх дзеці былі заўсёды «пры справе».

Лізавета ЛІСІЦА, вучаніца 7 класа Мажэйкаўскай СШ Лідскага раёна:

— Замена камп'ютарным гульням ёсць! Толькі, на жаль, з-за таго, што амаль у кожнага з нас ёсць камп'ютар, мала хто заўважае нешта іншае. Калі ў мяне яшчэ не было гэтай цуда-тэхнікі, мы з маімі сябрамі гулялі ў шматлікія гульні. А як толькі з'явіўся камп'ютар, іх стала значна менш. А з падключэннем інтэрнэту іх увогуле не стала: пачалі радзей выходзіць на вуліцу, менш сустракацца. Я разумею, што гэта няправільна, але сама такая ж: калі ёсць вольны час, адразу за камп'ютар! Максімум, колькі я магу без яго пратрымацца, гэта 2 дні!

Сяргей ГЕЙСЦЕР, галоўны навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл, доктар тэхнічных навук, прафесар:

— Важна зразумець прыроду захаплення камп'ютарнымі гульнямі. На мой погляд, гэта магчымасць самарэалізавацца ў віртуальным свеце, што далёка не заўсёды атрымліваецца ў рэальнасці. Адсюль вызначаюцца альтэрнатывы — гульні, якія дзіцяці па душы і ў якіх ён можа праявіць сябе. Прычым яны павінны быць даступнымі, разнастайнымі і займальнымі. Такімі альтэрнатывамі могуць стаць спартыўныя гульні, інтэлектуальныя (шахматы, шашкі), творчасць (напрыклад, радыёмадэляванне, авіямадэляванне, фатаграфія, маляванне, лепка). Не абысціся дзецям і без гульняў у дварэ з аднагодкамі, якія падыходзяць для рознага ўзросту: у квача, «вайнушку», футбол, мястэчкі (гульня забытая, а раней вельмі папулярная), хакей на дарозе без канькоў. Толькі на карысць будуць паходы ў лес, на рэчку.

Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

■ Парламенцкі дзённік

КАНСУЛЬТАЦЫІ ДЛЯ ЗАКАНАДАЎЦАЎ

Адбылося першае пасяджэнне створанай пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Навукова-кансультацыйнай рады па пытаннях развіцця эканомікі. Прызначэнне рады, у склад якой увайшлі вучоныя, прадстаўнікі Мінфіна, Мінэканомікі і прадпрыемстваў, — прыцягненне навуковай грамадскасці да падрыхтоўкі законапраектаў.

«Наша задача — паглядзець на законапраект больш шырока, каб пры неабходнасці ўнесці адпаведныя прапановы. Гэта дапаможа пазбегнуць сітуацыі, калі, здавалася б, добра прапрацаваны закон пры прымяненні на практыцы выклікае пытанні», — адзначыў Анатоль РУСЕЦКІ, віцэ-спікер верхняй палаты парламента, які ўзначаліў навукова-кансультацыйную раду па пытаннях развіцця эканомікі. Ён дадаў, што да работы рады важна прыцягваць і рэгіянальныя дзяржаўныя структуры, каб на месцах было разуменне таго, як будзе працаваць будучы закон.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі нагадаў, што сёння галоўны прыярытэт працы парламента — заканадаўчае забеспячэнне рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011—2015 гады. Зараз у партфелі навукова-кансультацыйнай рады 12 законапраектаў, якія маюць важнае значэнне для выканання гэтай задачы. Сярод іх праекты законаў «Аб канцэсіях», «Аб энергазберажэнні», «Аб інвестыцыях».

Ул. інф.

■ Адукацыя

ЛЕТНІ АДПАЧЫНАК У ШКОЛЬНІКАЎ НЕ СКАРОЦІЦЦА

«Змяншаць працягласць летніх канікул у гэтым годзе не плануецца», — заявіў падчас анлайн-канферэнцыі на БЕЛТА міністр адукацыі нашай краіны Сяргей Маскевіч.

Па словах міністра, гэта пытанне знаходзіцца зараз на стадыі абмеркавання ў сувязі з прапановамі, што паступаюць у міністэрства ў ходзе маніторынгу практыкі прымянення Кодэкса «Аб адукацыі».

— Пры вызначэнні працягласці летніх канікул трэба ўлічваць наступныя фактары: працягласць водпуску педагагічных работнікаў, тэрміны правядзення выпускных іспытаў і цэнтралізаванага тэсціравання, а таксама іншыя аспекты, — патлумачыў міністр. — Сёння агульная працягласць канікул на працягу ўсяго навучальнага года плюс летніх канікул складае ў Беларусі 123 каляндарныя дні — гэта на адзін дзень менш у параўнанні з Расійскай Федэрацыяй, Рэспублікай Казахстан, Украінай, а таксама з Кітайскай Народнай Рэспублікай.

Разам з тым міністр адукацыі канстатаваў, што ад педагогаў паступаюць прапановы зрабіць суботу вучэбным днём:

— Гэтая тэма неаднаразова паднімалася, але, падкрэсліваю, сёння ў Міністэрстве адукацыі пытанне аб тым, каб вярнуцца да шасцідзённага вучэбнага тыдня, не стаіць. Шосты дзень — школьны, і мы працуем над тым, каб 100 працэнтаў навучэнцаў хацелі б прыйсці ў суботу ў школу. У асобных выпадках у гэты дзень для старшакласнікаў праводзяцца факультатывы. Часта ў шосты дзень праводзяць розныя забаўляльныя мерапрыемствы для вучняў, спартыўныя або інтэлектуальныя спаборніцтвы. І многія бацькі таксама наведваюць гэтыя мерапрыемствы. Таму зараз у першую чаргу задача заключаецца ў тым, каб шосты дзень максімальна выкарыстоўваўся для індывідуальнага развіцця і ўмацавання здароўя навучэнцаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Жыллё

Больш як 55 тысяч грамадзян краіны валодаюць дзвюма і больш кватэрамі

Пра гэта паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Міхаіл Расолька.

Спецыяліст падатковай галіны патлумачыў, што ўласнікі дзвюх і больш кватэр павінны плаціць у бюджэт краіны падатак на нерухомасць. Найбольшая колькасць такіх грамадзян жыве ў Мінску — каля 19,5 тысячы чалавек.

Прыкладна на 10 працэнтаў за апошні год павялічылася колькасць грамадзян, якія аплачваюць падаходны падатак з даходаў ад здачы ў арэнду жылых і нежылых памяшканняў. У 2012 годзе было зафіксавана 102 тысячы такіх падаткаплацельшчыкаў. Найбольш актыўна такім відам дзейнасці займаюцца гаспадары жылля ў Мінску, дзе летась свае кватэры здавалі ў арэнду ажно 44 тысячы чалавек. Увогуле летась колькасць падаткаплацельшчыкаў сярод фізічных асоб склала больш як 3 млн чалавек. Усяго за мінулы год яны самастойна заплацілі ў бюджэт 1 трлн 890,5 млрд рублёў падаткаў. Амаль 2,5 млн чалавек аплачваюць зямельны падатак і падатак на нерухомасць. Агульная сума падатку на нерухомасць летась склала 128,8 млрд рублёў, зямельнага падатку — 46,1 млрд, адзінага падатку — 16,6 млрд рублёў.

Падатковымі агентамі (арганізацыямі) было ўтрымана з фізічных асоб у 2012 годзе падаходнага падатку ў бюджэт краіны на суму каля 19 трлн рублёў. Паводле звестак на пачатак года, у падатковых органах быў зарэгістраваны 232 851 індывідуальны прадпрымальнік, што на 13 566 чалавек больш за ўзровень 2011 года. Усяго ад індывідуальных прадпрымальнікаў у бюджэт паступіла 2,3 трлн рублёў падаткаў і збораў.

Сяргей КУРКАЧ.

КІРАЎНІЦТВА СТАЛІЦЫ ГАТОВА ПАДТРЫМАЦЬ ІДЭЮ ДОЛЕВАГА БУДАЎНІЦТВА СТУДЭНЦКІХ ІНТЭРНАТАЎ

Пра гэта, як перадае карэспандэнт агенцтва «Мінск—Навіны», паведаміў напярэдадні на сустрэчы са студэнтамі, якія пражываюць у інтэрнаце № 1 Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (БДЭУ), намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар Карпенка. Паводле яго слоў, такая падтрымка стане асабліва актуальнай для прыватных ВНУ.

«Мінск—Навіны»

■

АД КОСМАСУ — ДА МЕДЫЦЫНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яго гранічнае распазнаванне складае 2,1 метра. Гэтага дастаткова для таго, каб выконваць розныя задачы, звязаныя з зандзіраваннем зямной паверхні, выяўленнем ачагоў пажараў, вывучэннем і падлікам прадстаўнікоў жывёльнага свету і гэтак далей. Ужо заключаны дагаворы з усімі ведамствамі, зацікаўленымі ў выкарыстанні касмічных даных. Па сутнасці, ствараецца новая для нашай краіны галіна. На 2013 год намечана стварэнне серыйнай вытворчасці беспілотных лятальных апаратаў.

Паколькі тэрмін службы беларускага касмічнага апарата складае пяць гадоў, то бліжэй да 2017 года Беларусь павінна будзе запусціць новы спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Сяргей Чыжык упэўнены, што Беларусь здольная стварыць спадарожнік з максімальным распазнаваннем 0,5 метра.

Па словах Сяргея Чыжыка, беларускім навукоўцам ёсць чым пахваліцца як у галіне фундаментальных, так і ў галіне прыкладных даследаванняў. Напрыклад, беларускія фізікі навучыліся працаваць з адзінкавымі фатонамі і выкарыстоўваць іх для аховы інфармацыі. Хімікі распрацавалі танкаплёначныя тэхналогіі, якія дазволілі стварыць 3Д- акуляры — больш дасканалыя за імпартныя аналагі. Фізіёлагі і біяфізікі стварылі ўстройства, якое дазваляе паскорыць пераўтварэнне ствалавых клетак у нейроны, што вельмі важна для тэрапіі захворванняў кровазвароту мозга. Ужо вядзецца будаўніцтва цэнтра клетачных тэхналогій на базе Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук, дзе, як мяркуецца, будуць прадастаўляцца паслугі з выкарыстаннем ствалавых клетак.

У Акадэміі навук на кожны рубель бюджэтных сродкаў, выдзеленых у 2012 годзе з рэспубліканскага і саюзнага бюджэтаў, прыпадае 3,4 руб. зароблены сродкаў.

За 1,5 года на аснове акадэмічных інстытутаў і вытворчых прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці былі створаны і развіваюцца тры дзясяткі інавацыйных біятэхналагічных вытворчасцяў. Інфарматыкі і біяхімікі, выкарыстоўваючы метады камп'ютарнага мадэлявання, ажыццявілі матэматычны дызайн чатырох хімічных спалучэнняў, якія ўяўляюць сабой перспектыўныя базавыя структуры для стварэння новых лекавых прэпаратаў супраць СНІДу. Фактычна размова ідзе пра камп'ютарнае праектаванне будучых лекаў на малекулярным узроўні.

Супрацоўнікі Аб'яднанага інстытута прыкладных даследаванняў ва ўзаемадзеянні з навукоўцамі і практыкамі на базе пяці мінскіх паліклінік увялі ў эксплуатацыю пілотны ўзор размеркавання тэлемедыцынскай сістэмы па лічбавай мамаграфіі. У 2012 годзе было праведзена ўжо больш як 2,7 тысячы дыстанцыйных кансультацый.

Важнай задачай, пастаўленай кіраўніком дзяржавы перад Нацыянальнай акадэміяй навук, з'яўляецца стварэнне ў 2013 годзе інавацыйнага цэнтра «Сколкава —Беларусь». Гэта пытанне прыцягнення ў навуку моладзі і дадатковага стымулявання вучоных.

Натуральна, журналісты не маглі не пацікавіцца ў Сяргея Чыжыка памерам заробкаў беларускіх навукоўцаў.

— Сярэдні заробак па Акадэміі навук склаў летась 3,9 мільёна рублёў, а ў навуковых супрацоўнікаў — 4,3 мільёна рублёў. Але ўсё залежыць ад лабараторыі і задач, якія яна вырашае: калі лабараторыя мае пазабюджэтныя сродкі, то заробкі могуць быць вышэйшыя — і 6, і 8 мільёнаў рублёў.

Увогуле ў Акадэміі навук на кожны рубель бюджэтных сродкаў, выдзеленых у 2012 годзе з рэспубліканскага і саюзнага бюджэтаў, прыпадае 3,4 руб. зароблены сродкаў, а доля прыцягнутых пазабюджэтных сродкаў склала 71,1%.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НА ШТО ЗДОЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА?

Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Некаторыя інфекцыі вельмі складана знішчыць канчаткова. Яны застаюцца і могуць праяўляцца зноў і зноў. Часам здараюцца такія сітуацыі, калі чалавеку даводзіцца паміраць на бальнічным ложку, хоць у медыкаў ёсць поўны арсенал для барацьбы з яго хваробай. Проста ў канкрэтным выпадку ён не спрацоўвае. Наша работа можа выправіць гэты недахоп. Дарэчы, праектам ужо цікавяцца за мяжой. Не буду называць канкрэтных тэрмінаў, але магу сказаць, што мы ўжо вельмі далёка прасунуліся ў гэтай працы.

— Вы самі выбралі такую сферу навуковай дзейнасці?

— Скажам так: навука фінансуецца выключна дзяржавай. Яна і вызначае кірункі нашай працы. Прапаноўвае, чым займацца. Але звычайна сфера даследаванняў супадае з тым, што цікава пэўнаму навукоўцу. Дарэчы, існуе такая думка, што ўвогуле не бывае нацыянальнай навукі. Навука — рэч касмапалітычная. Калі не зробім мы — зробяць іншыя.

— Дзмітрый, вы сказалі, што на біяфак трапляюць выпадковыя людзі. Ці значыць гэта, што спецыялістаў у біяхіміі занадта шмат і не трэба набіраць вялікую колькасць новых студэнтаў?

— Не, ні ў якім разе. Гэта азначае адваротнае — нам зараз трэба як мага больш якасных, кваліфікаваных, матываваных выпускнікоў. Такіх людзей нам не хапае. Думаю, не хапае іх і біяфаку.

— А калі гаварыць увогуле пра сучасную беларускую навуку, як вы ахарактарызуеце яе стан? Магчыма, ёсць нейкія спецыфічныя праблемы?

— Нягледзячы на ўвесь скептыцызм, я ацэньваю стан нашай навукі як добры. У нас вельмі шмат сапраўды сур'ёзных дасягненняў, беларускія вучоныя публікуюцца ў самых вядомых сусветных навуковых выданнях. Напрыклад, супрацоўнікі нашага інстытута не так даўно публікаваліся ў амерыканскіх. Галоўны недахоп, вядома, у сродках. Нам выдаткоўваюць даволі вялікія грошы, але абсталяванне каштуе вельмі дорага, таму мы ўсё адно значна адстаём ад вядучых краін. Большая частка тэхнікі — замежнай вытворчасці. Ёсць, праўда, і беларуская, напрыклад, вось гэты спектрафатометр «Саларх», які серыйна вырабляюць у нас. Мы карыстаемся і айчыннымі суперкамп'ютарамі. Але я шчыра ўпэўнены ў тым, што беларуская навука здольная на большае, чым ёсць зараз.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

■ Соцыум

РЫТУАЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ ПАДАРАЖЭЛІ

Максімальныя тарыфы на рытуальныя паслугі ў сталіцы павысіліся на 80 працэнтаў. Пастановай Мінгарвыканкама №4036, якая была прынята яшчэ напрыканцы снежня мінулага года, але ўступіла ў сілу некалькі дзён таму, пасля афіцыйнага апублікавання, цяпер па-новаму акрэсліваецца мяжа кошту той ці іншай паслугі.

Зараз сваякам памерлага, у выпадку неабходнасці арандаваць машыну для пахавання ў Мінску, замест максімальнай сумы ў 218,6 тысячы рублёў, магчыма, давядзецца заплаціць 393,5 тысячы. Максімум за арэнду аўтатранспарту ў межах Беларусі павысіўся з 74,3 тысячы рублёў за гадзіну да 133,8 тысячы. Гранічны тарыф на капанне магілы ўручную ў зімовы час цяпер складае 747,6 тысячы рублёў, у той час як раней сума была — 415,3 тысячы рублёў. Выкапаць магілу летам, паводле ранейшых тарыфаў, каштавала да 196,7 тысячы рублёў. Новая сума — 354,1 тысячы рублёў.

Чым абумоўлена такая значная змена? Няўжо сапраўды арганізацыі, што займаюцца аказаннем рытуальных паслуг, будуць устанаўліваць цэны за сваю працу па максімуме? Па каментарый карэспандэнт «Звязды» звярнулася ва ўпраўленне антыманапольнай і цэнавай палітыкі Мінгарвыканкама.

Па словах начальніка гэтага ўпраўлення Сяргея Міцінскага, устаноўлены максімальны тарыф зусім не азначае, што цэны рэзка скокнуць уверх і за рытуальныя паслугі давядзецца плаціць адразу менавіта акрэсленую ў пастанове суму. Яна можа быць і меншай.

— Рытуальныя паслугі з'яўляюцца стратнай галіной у гарадскім бюджэце, таму змены ў коштах непазбежныя. У Мінску манапалістам па аказанні рытуальных паслуг з'яўляецца камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Спецкамбінат КБА», таму адносна цэнаўтварэння ўсе іншыя арганізацыі, што аказваюць такія паслугі, павінны на яго арыентавацца. Перш чым павышаць свае цэны, іх трэба задэкларваць ва ўпраўленні антыманапольнай і цэнавай палітыкі, — сказаў суразмоўца.

Сяргей Міцінскі дадаў, што аптымальныя лічбы ў межах новых максімальных тарыфаў для прадпрыемства «Спецкамбінат КБА» будуць вызначаны на наступным тыдні.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

■ Як нас дураць

БРЭНД НА ЎПАКОЎЦЫ ЁСЦЬ, А САПРАЎДНАЯ КАВА?

Аператыўнікі службы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Міністэрства ўнутраных спраў правялі маштабную аперацыю па спыненні незаконнай пастаўкі з Расіі падробленай кавы «Нестле» і далейшай яго рэалізацыі на тэрыторыі нашай краіны.

Аперацыя праводзілася адначасова па ўсёй Беларусі. На рынках, у дробнарозначных аб'ектах гандлю Мінска і абласных цэнтраў была канфіскавана буйная партыя растваральнай кавы з яўнымі прыкметамі падробкі. Агулам было выяўлена і выведзена з нелегальнага абароту амаль 5 тысяч кантрафактных упаковак кавы вагой па 2, 75, 150, 320 і 750 грамаў на агульную суму больш за 60 мільёнаў рублёў.

Супрацоўнікі ГУБЭЗ МУС разам з афіцыйным прадстаўніком кампаніі «Нестле Расія» ў нашай краіне правялі даследаванне ўзораў сумніўнага напою. Экспертыза ўстанавіла, што ў падробцы выяўлены кававы напой з наяўнасцю алею зерняў ячменю і жыта, у той час як у сапраўднай каве павінны быць выключна кававыя зярняты. Адрозналася падробка ад арыгінальнага тавару тым, што кантрольны ідэнтыфікацыйны знак на ўпакоўках адсутнічаў або быў падробленым. Выява на ўпакоўцы была нізкай якасці, яе колер святлейшы, дата вырабу з тэрмінам прыдатнасці выбіты не заводскім спосабам, а надрукаваны разам з выявай і размешчаны не ва ўстаноўленым месцы.

— Гэта першы выяўлены выпадак пастаўкі і рэалізацыі фальшывай кавы ў нашай краіне, — паведаміла старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУБЭЗ МУС Вераніка Пасмеццева. — А ў Расіі, як вядома, яны не адзінкавыя. У тым, што ў суседняй краіне падобных цэхаў, якія ў саматужных умовах вырабляюць «каву» ў прамысловых маштабах, няма сумненняў. Па нашай ацэнцы, аб'ём гадавога абароту кантрафактнай кавы толькі па адным найменні можа дасягаць 500 тысяч упаковак на суму звыш 800 тысяч доларaў ЗША. Зараз праводзіцца далейшая праверка, па выніках якой правапарушальнікам пагражае адміністрацыйнае пакаранне ў выглядзе штрафу, канфіскацыі і знішчэння адпаведнай прадукцыі.

Як аказалася, летась аператыўнікаў пры правядзенні аналізу аб'ёмаў рэалізацыі асобных відаў тавараў на ўнутраным рынку краіны зацікавіла такая група тавараў, як кава. Аб'ёмы яго імпарту знізіліся практычна ў два разы, а аб'ёмы вытворчасці — у пяць разоў. Падчас маніторынгу і праведзеных аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў было ўстаноўлена, што адной з прычын зніжэння афіцыйнага імпарту кавы ў Беларусь з'яўляецца яе неафіцыйны ўвоз з Расійскай Федэрацыі з мэтай далейшай рэалізацыі ў гандлёвай сетцы праз індывідуальных прадпрымальнікаў. Паколькі кошт кавы, што ўвозіцца нелегальна, істотна ніжэйшы, чым у афіцыйнага пастаўшчыка, узнікла абгрунтаванае сумненне: ці сапраўды гэтая кава выраблена на прадпрыемстве, чый брэнд маецца на ўпакоўцы?

Калі грамадзяне знойдуць у продажы тавар з яўнымі прыкметамі падробкі, яны могуць звярнуцца ў міліцыю па тэлефоне 102 або да афіцыйнага прадстаўніка кампаніі «Нестле Расія» па нумары 200 77 22.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

НА ФОТАПАРТРЭТАХ — ПРАВЕДНІКІ

Сёння ў Музеі гісторыі Мінска адкрываецца фотавыстава звяздоўца Анатоля Клешчука «Мае Праведнікі».

Гэта ўнікальная калекцыя фотаздымкаў мае не толькі культурную, але і гістарычную каштоўнасць. Здымкі адбываліся на працягу амаль 20 гадоў у розных куточках краіны, на іх — амаль усе беларускія Праведнікі ў іх паўсядзённым жыцці. Выстава праводзіцца па ініцыятыве Прадстаўніцтва ААН у Беларусі і прымеркавана да Міжнароднага Дня памяці ахвяр Халакосту, які адзначаецца па рашэнні Генеральнай Асамблеі ААН штогод 27 студзеня.

У цырымоніі адкрыцця прымуць удзел прадстаўнік ААН у Рэспубліцы Беларусь Санака Самарасінха, пасол Ізраіля ў Беларусі Іосіф Шагал, Праведнікі Народаў Свету, былыя вязні Мінскага гета і аўтар фотаработ Анатоль Кляшчук. Таксама адбудзецца ўручэнне медаля і сертыфіката аб прысваенні звання Праведніка Народаў Свету сыну Марыі Маісеенкі, якая ў час нямецкай акупацыі дапамагала ратаваць яўрэяў.

У Беларусі за гады Другой сусветнай вайны ад рук фашысцкіх захопнікаў загінула больш за 800 тысяч людзей яўрэйскай нацыянальнасці. Шмат каму з 30 тысяч ацалелых ахвяр Халакосту ўдалося выжыць дзякуючы мужнасці менавіта тых, каго пасля вайны назавуць Праведнікамі. На 1 студзеня 2012 года гэтае ганаровае званне было прысвоена 569 беларусам (8-е месца ў свеце), а наогул яго атрымалі 24 тыс. 356 чалавек.

Адкрыццё выставы адбудзецца а 15 гадзіне.

Ул. інф.

ЛІСТЫ ПУШЧАНСКАМУ ДЗЕДУ

Беларускі Дзед Мароз атрымаў у навагоднія святы больш за 20 тысяч лістоў ад дзяцей.

Прыкладна палова пісем была дастаўлена поштай, астатнія прыйшлі ў электронным выглядзе. За амаль дзесяцігоддзе існавання маёнтка ў Белавежскай пушчы яго гаспадар атрымаў сотні тысяч пасланняў. Усе лісты ён чытае, па магчымасці старэнна адказаць. Самыя цікавыя з допісаў захоўваюцца гадамі ў Скарбніцы Дзеда Мароза. Тут жа знаходзяцца і падарункі, многія дзеці шлюць свайму любімаму персанажу малюнкі, сувеніры, выкананыя сваімі рукамі. Апошнім часам карэспандэнцыя паступае з многіх краін-суседак, а таксама — з ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Кітая, іншых краін.

Яна СВЕТАВА.

МАЛАДЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ АБ'ЯДНАЮЦЦА Ў КЛУБ

Першае пасяджэнне клуба «Малады спецыяліст» адбудзецца ў Касцюковічах 8 лютага.

Клуб будзе працаваць пры моладзевым культурным цэнтры «Юнацтва». Усіх маладых спецыялістаў запрашаюць браць удзел у яго рабоце. Толькі летась у Касцюковіцкі раён прыехалі 188 маладых спецыялістаў. А ўвогуле іх цяпер налічваецца каля 250 чалавек. У аддзеле моладзі лічаць, што найперш ім трэба добра пазнаёміцца: людзям, не мясцовым жыхарам, часам цяжка знайсці кола зносінаў, прызвычаіцца на новым месцы. Па-другое, ім трэба абмяняцца вопытам, абмеркаваць ільготы і гарантыі, якія прадастаўляюцца маладому спецыялісту на прадпрыемстве ці ў гаспадарцы.

— Нам бы хацелася, каб маладыя людзі адаптаваліся ў працоўным жыцці і актыўна ўключыліся ў грамадскую дзейнасць, — сказала пра мэты новага клуба кіраўнік аддзела па справах моладзі Касцюковіцкага райвыканкама Надзея Якушава.

Ілона ІВАНОВА.

ДАДАТКОВЫ «ЗАРОБАК» БУХГАЛТАРА...

Два месяцы запар бухгалтар аднаго са сталічных прадпрыемстваў падманвала сваіх працадаўцаў, незаконна пералічыўшы ў выніку на сваю банкаўскую картку 52 мільёны рублёў. Праўда стала вядомай не адразу...

Паводле інфармацыі Кастрычніцкага РУУС сталіцы, раней 42-гадовая ўраджэнка Гродзенскай вобласці ўжо была асуджана за незаконнае прысвойванне грашовых сродкаў, у выніку чаго бухгалтарскай справай займацца ёй было забаронена. Пераехаўшы ў Мінск, жанчына доўгі час не магла афіцыйна працаўладкавацца па прафесіі. А калі тэрмін забароны скончыўся, дама «падкарэктавала» свой воблік у рэзюме, якое пачала актыўна рассылаць па інтэрнэце ў арганізацыі. «Кваліфікаваным» спецыялістам хутка зацікавілася кіраўніцтва аднаго буйнога сталічнага прадпрыемства, якое займалася харчовай вытворчасцю. Так неўзабаве жанчына ўзначаліла ім бухгалтарскі аддзел. І як толькі ў яе адкрыўся доступ да матэрыяльных рэсурсаў, тут жа не прамінула скарыстацца сітуацыяй на сваю карысць. Пад выглядам камандзіровачных расходаў і аплаты за паліва па няхітрай схеме «галоўны бухгалтар» пачала пералічваць сродкі на ўласную банкаўскую картку. За два месяцы такім чынам «набегла» 52 мільёны рублёў.

Калі ёсць шмат лёгкіх грошай, іх жа патрэбна траціць? Жанчына пачала весці разгульнае жыццё, што ў выніку сказалася на якасці выканання службовых абавязкаў. Па заканчэнні выпрабавальнага тэрміну работніцу «папрасілі». Трымацца за месца тая не стала. Недастачу выявіў новы спецыяліст, які скрупулёзна прымаў справы. Быў зварот у міліцыю, якая і затрымала зламысніцу. Тая, дарэчы, была ў актыўным пошуку новага месца працы...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАРЫ «ГАРУЧКІ» ЎСПЫХНУЛІ

Ранкам 37-гадовы жыхар вёскі Падваложка Бярэзінскага раёна нёс пластыкавую ёмістасць з лёгкаўзгаральнай вадкасцю. І вырашыў закурыць...

У выніку адбылося загаранне пароў той вадкасці, і мужчына атрымаў тэрмічныя апёкі. Пацярпелага шпіталізавалі ў хірургічнае аддзяленне раённай бальніцы.

У гэты ж дзень увечары, як расказала старшы інспектар цэнтра прапаганды МНС Таццяна Шарамет, падобны выпадак адбыўся ў Мінску. Тут на вуліцы Прамысловай кіроўца грузавога аўтамабіля вырашыў разагрэць паліва ў баку пры дапамозе адкрытага агню. І меў няшчасце пераканацца, што пары лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцяў таксама добра гараць... Мужчыну шпіталізавалі з тэрмічным апёкам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГАРЭЛКА Ў... ГАЗАВЫМ БАЛОНЕ

45 літраў гарэлкі грамадзянін Літвы схаваў у газавым балоне свайго аўтамабіля «Volkswagen», аднак падмануць беларускіх пагранічнікаў і мытнікаў у пункце пропуску «Беняконі-1» не ўдалося.

Машына і кантрабандныя спіртныя перададзены ў мытню, дзе чакаюць судовага рашэння, паведамляе прэс-цэнтр Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі.

Увагу пагранічнага наряда прыцягнуў таксама рэзервовы лакаматыў у пункце пропуску «Гудагай-1»: у кабіне машыніста пад масніцай выявілі ў дзвюх секцыях 10 каністраў з дызельным палівам — па 30 літраў у кожнай. Відавочна, што такім чынам салярку разлічвалі даставіць у суседнюю Літву.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СКРАЎ ТРЫ КАШАЛЬКІ І СЕРАБРО Ў КАВЯРНІ

У Віцебску злодзей скраў адразу у трох жанчын, рабочых кавярні, кашалькі з грашыма, банкаўскімі карткамі і сярэбранымі вырабамі. Памер агульнай шкоды перавышае 2 мільёны рублёў.

Супрацоўнікі Кастрычніцкага раённага аддзела ўнутраных спраў Віцебска ўстанавілі, што невядомы нейкім чынам незаўважна пранік у незамкнутае падсобнае памяшканне кавярні, дзе і ўчыніў крадзеж. Па падазрэнні ва ўчыненні злачынства затрыманы 23-гадовы непрацуючы мясцовы жыхар. Аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАНЯДЗЕЛАК, 28 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 18.45, 23.35 Зона Х.
9.15 У цэнтры ўвагі.
10.10 Камедыя «Кідалы ў гульні».
12.10 Клуб рэдактараў.
12.55 Вакол планеты.
13.45 Журналісцкае расследаванне.
14.25 Тайны следства.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Дэтэктыў «У жніўні 44-га...».
17.35 Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
18.30 «Трыумф. Героям спорту». Дзённік.
19.40 Калыханка.
19.55 Серыял «Джамайка».
21.00 Панарама.
21.40 Форум.
22.40 Серыял «Бігль».
0.00 Дзень спорту.
0.10 Серыял «Зорныя вароты. Першы атрад».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Танна і добра».
12.00 «Уладзімір Высоцкі і Марына Уладзі. Апошні пацалунак».
13.10 «Добрага здаровейка!».
14.10 «Модны прыгавор».
15.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
16.15 «Ты не адзін».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік». «Жнівень 17-га. Стаўка на Магілёў» (Фільм першы).
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Адкрыты фармат».
22.10 «Вячэрні Ургант».
22.50 Маст. фільм «Рабыня кахання».
0.30 Начныя навіны.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 20.50 Тэлебарометр.
9.05, 17.50 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
10.10 Навіны надвор'я.
10.40 Дак. фільм «Міхаіл Пташук».
11.10, 0.15 Дак. серыял «Мудрагелістыя светы».
12.30 Камедыя «Дванаццаць крэслаў». 1-я і 2-я серыі.
15.30 Пад грыфам «Вядомыя».
16.00, 23.45 Серыял «Деффчонки».
16.40 Беларуская часінка.
18.55 Меладрама «Ваенна-палявы раман».
20.55 Хакей. КХЛ. «Славан» — «Дынама» (Мінск). У перапынку: **21.25** КЕНО.
23.15 Авертайм.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00 «Тыдзень».
10.10 «Жыць будзеце».
10.40 «Пад абаронай».
11.10, 17.30 «Званая вячэра». Лепшае.
12.05 «Сямейныя драмы».
13.00 Рэпарцёрскія гісторыі.
13.50 «Вялікі горад».
14.30 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
16.20 «Наша справа».
16.50 «Следакі». Серыял.
18.30 «Слова жанчыне». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Страшны суд».
23.00 «Ваенная тайна».
0.40 Да 70-годдзя з дня нараджэння народнага артысты Беларусі Міхаіла Пташука. Драма «Вазьму твой боль».

МІР

5.00 Серыял «Агонь кахання».
6.40 М/с «Апошні з магікан».
7.10 «Цік-так».
7.40 «Джэймі: Абед за 30 хвілін».
8.10 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
9.00, 11.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 Серыял «Гарачы лёд».
11.00 «Разам».
12.25 «Агульны інтарэс».
12.40 «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
13.15, 1.40 Маст. фільм «Ваш сын і брат».
15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
17.00, 22.45 Ток-шоу «Слова за слова».
18.30 «Акцэнты».
18.50 «Саюзнікі».
19.15 «Усюды жыццё».
19.45 «Сардэчна запрашаем».
20.10 «Беларусь сёння».
21.25 «Свет спорту».
21.55, 3.00 Дак. фільм «У свеце сакрэтных ведаў».
23.35 Серыял «Камісар Наварро».
1.15 «Зроблена ў СССР».
4.00 Дак. фільм «Цюркі Расіі».

8 КАНАЛ

7.00, 12.15, 18.45, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
7.05 «На рыбалку».
7.20, 15.00 Серыял «Клан Сапрана».
8.30, 14.30 Серыял «Джэйн Эйр» (заключная серыя).
9.00, 17.45 Серыял «Злачынная імперыя».
10.00 «TUT woman tv».
10.15 Драма «Адплата».
12.20 Драма «Уладар буры».
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2012 г. и основных показателях производственной программы и финансового плана на 2013 год.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Отчет Ревизионной комиссии Общества.
4. О выборах Наблюдательного совета Общества.
5. О выборах Ревизионной комиссии Общества.
6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. О размере вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества.

Наблюдательный совет Общества.

УНН 100088852.

Служебную картку кіраўніка прадстаўніцтва **ТАА «Тэхнасэрвіс»** (УНП 102360384) № 4629 Міністэрства замежных спраў РБ на імя Стралец Вольгі Сямёнаўны **лічыць несапраўднай** у сувязі са стратай.

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КС № 1304217 **считать недействительным.** *УНП 101883943*

РЕЗУЛЬТАТЫ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

ОАО «Лифтсервис» за 2012 год

№ п/п	Наименование показателей	Ед. изм.	2012 год
1	Выручка от реализации работ (услуг)	млн. руб.	52 708
2	Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	млн. руб.	50 179
3	Прибыль от реализации товаров, продукции, работ, услуг	млн. руб.	1 234
4	Начисленные налоги и сборы из прибыли	млн. руб.	688
5	Дебиторская задолженность	млн. руб.	4 821
6	Кредиторская задолженность	млн. руб.	4 054
7	Чистая прибыль, всего в том числе: расходы на оплату труда из чистой прибыли	млн. руб.	586
8	Направлено чистой прибыли на увеличение уставного фонда	млн. руб.	0
9	Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн. руб.	162
10	Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде, всего	руб.	800
11	Количество акционеров, всего в том числе: юридических лиц физических лиц	чел. % акций чел.	803 19,08 802
12	Среднесписочная численность работающих	чел.	806

Генеральный директор **С.А. Новиков**

Главный бухгалтер **С.Ф. Шорец**

УНН 100088852

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона)

по поручению Минского райпо (продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

Лот № 1: производственно-складское здание, инвентарный номер 600/С-135550, об.пл. 355,3 кв.м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Горанский с/с, **д. Новое Поле.** Начальная цена с НДС – **880 000 000 бел.руб.** Площадь земельного участка – **0,0664 га** (предоставлен продавцу на праве аренды по 29.09.2110. Ограничения: охранная зона ЛЭП до 1000 Вольт, пл. 0,0016 га). Обременения: договор аренды.

Лот № 2: магазин, инвентарный номер 600/С-105006, об.пл. 128,5 кв.м., расположенный по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, **д. Закружка.** Начальная цена с НДС – **240 000 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,1217 га.** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования);

Лот № 3: магазин, инвентарный номер 600/С-134978, об.пл. 79,3 кв.м, расположенный по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Петришковский с/с, **аг. Петришки.** Начальная цена с НДС – **125 000 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,0343 га** (предоставлен продавцу на праве аренды по 07.11.2110. Ограничения: водоохранная зона Вилейско-Минской водной системы, пл. 0,0343 га). Обременения: договор аренды.

Лот № 4: магазин, инвентарный номер 600/С-132718, об.пл. 106,5 кв.м, расположенный по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Лошанский с/с, **д. Слобода. Начальная цена с НДС – 120 000 000 бел.руб.** Площадь земельного участка – **0,0700 га** (предоставлен продавцу на праве аренды по 03.08.2041. Ограничения в использовании: водоохранная зона пруда вне прибрежной полосы, пл. 0,0700 га).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**.

Аукцион состоится **26.02.2013** в 12.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, офис 5.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.02.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел: +375 17 280 36 37;
+375 29 183 69 71.

■ Экадом

НЕТЫПОВАЯ ВЁСКА, НЕСТАНДАРТНАЕ ЖЫЛЛЁ

Тутэйшы Дом культуры нічым не адрозніваецца ад аналагічных установаў Германіі, Францыі і гэтак далей — як звонку, так і ўнутры. Жылыя дамы на першы погляд — як іншыя ў нашай краіне. Але на самой справе яны вельмі адрозніваюцца ад тыповых, бо выраблены не з дрэва і цэглы, а з дранкі і... трыснягу. Больш за тое — прастаяць некалькі стагоддзяў дакладна, абяцаюць будаўнікі. Што цікава: будавалі нестандартнае жыллё, як і аб'екты сацыяльнага прызначэння, не прафесіянальныя будаўнікі, а валанцёры з краін Еўрасаюза і нашы.

Вось гэта вуліца!

Вясёлкавая вуліца — гэта цэлае «мініі»-паселішча ля вёскі Стары Лепель у Лепельскім раёне.

— У 2001 годзе на гэтым месцы было, як той казаў, чыстае поле. Мы прапанавалі тады старшыні райвыканкама пабудаваць тут экалагічную вёску. Намі ўжо быў напрацаваны вопыт — у Мядзельскім раёне, на беразе возера Нарач будавалі вёску для перасяленцаў з «чарнобыльскай зоны»... І шукалі іншае месца для рэалізацыі новага праекта. Нам пад Лепелем прапанавалі тры пляцоўкі, — расказваюць кіраўнікі міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «ЭкаДом». — Спадабалася адна з іх, бо побач славутае Лепельскае возера — самае вялікае ў раёне. Дамовіліся, што пачнём з будаўніцтва дзесяці дамоў для чарнобыльскіх перасяленцаў з Магілёўскай, Гомельскай абласцей. А мясцовая ўлада фінансуе ўсю неабходную інфраструктуру — маюцца на ўвазе інжынерныя камунікацыі. Рэалізуе гэты праект таксама грамадскае аб'яднанне «Дамы замест Чарнобыля».

Супрацоўніцтва з уладай раённага ўзроўню атрымалася. Сёння пабудавана ля Старога Лепеля 26 дамоў — камфортных, з мансардамі. Ёсць у паселішчы асфальтаваная дарога, ачышчальныя збудаванні. Плошча кожнага дома — 140 квадратных метраў. Пры іх будаўніцтве прымяняецца нетыповая для Беларусі тэхналогія — так вякамі будуюць немцы. Фасады дамоў уцепляюцца плітамі з трыснягу. Сцены дома лёгка «дыхаюць» і не вылучаюць шкодных рэчываў, звязаных з цеплавой апрацоўкай.

Тая самая вуліца.

Аналагічныя дамы ў Германіі стаяць па 300-400 гадоў, і іх лёгка ўтылізаваць. Матэрыялы: гліна, дранка, уцяпляльнік з трыснягу...

Цікава, дарэчы, што трыснёг купляюць і ў тутэйшых — па 6-7 тысяч рублёў за ахапак. І ад ахвотных зарабіць на ім адбою няма...

Клуб, або культурна-адукацыйны цэнтр — сапраўдная Мека для вяскоўцаў. Тут ёсць гульнявыя комплексы, працуюць розныя гурткі для дзяцей і дарослых. Сюды можна проста зайсці «на гарбату» і абмеркаваць навіны. Вы-

Натхнілі... валанцёры

Фельчарска-акушэрскі пункт здадуць пад ключ сёлета. У гэтым будынку таксама будзе жыць медыцынскі работнік. ФАП — энергаэфектыўны будынак, на даху якога ўстановяць сонечныя батарэі. Для яго будаўніцтва таксама выкарыстоўваюцца экалагічна чыстыя матэрыялы.

кладчыкі — валанцёры, якія працуюць на ўмовах дагавора падраду, а яшчэ — спецыялісты з сістэмы адукацыі раёна: яны спецыяльна прыязджаюць на Вясёлкавую папрацаваць з дзецьмі.

У клубе разам з фондам «Узаемаразуменне» рэалізуецца праграма «Дыялог» — для наладжвання стасункаў паміж пажылымі і моладдзю. Проста, як у Еўропе.

Усяго на Вясёлкавай вуліцы жывуць 23 сям'і, у якіх выхоўваецца 76 дзяцей.

Зайшоў у адзін з дамоў. Дзверы адчыніла гаспадыня Ганна Паўлючкова. Расказала, што жыве тут ужо трэцюю зіму, а прыехала з Гомельскай вобласці. Пакуль не працуе, бо ў дэкрэтным водпуску.

— А адкуль даведаліся аб праекце?

— Аднавяскоўцамі нашымі была таксама маладая сям'я. Яны збіралі даведкі, каб перасяліцца пад Лепель, і нам расказалі пра такую магчымасць. А іх у сваю чаргу «натхнілі» валанцёры, якія прыязджалі ў нашу вёску.

— Колькі пакояў у доме?

— Спальня, зала, кухня, а на другім паверсе будуць яшчэ тры пакоі — іх трэба рабіць самім.

— А ці адрозніваецца гэты дом, напрыклад, ад ранейшага жылля?

— Так, вельмі. Гэты больш цёплы, для абагрэву «бярэ» менш паліва. Ваду падагравае электрычны бойлер...

Усе дарослыя жыхары Вясёлкавай забяспечаны работай на спецыяльнасці.

Ад 16-ці і да 80-ці

Дамы будучым жыхарам перадаюцца ў прыватную уласнасць бясплатна. Па ўмовах рэалізацыі праекта, у іх маюць права жыць тыя перасяленцы, у каго няма ўласнага жылля. Звычайна за год будуецца 2-3 такія дамы, бо грамадская арганізацыя невялікая.

На сёлета чарговая валанцёрская змена запланавана на жнівень. Зноў прыедуць валанцёры з Германіі, Італіі, Беларусі. Беларускі офіс аб'яднання знаходзіцца ў Мінску. Тыя ж немцы прыязджаюць на змену арганізавана, на аўтобусе (нашым трэба толькі дабрацца да райцэнтра, дзе іх сустрэнуць і адвязуць да месца працы валанцёрскага летніка). Іншаземцаў падштурхоўвае шчырае жаданне дапамагчы тым, хто пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Валанцёры могуць жыць у палатках або ў пабудаваных дамах. У кожным доме па пяць пакояў — месца хопіць!

Харчаванне для іх арганізуецца ў будынку базавай школы, недалёка ад «пасёлка» перасяленцаў. Дарэчы, школьнікам пашанцавала, бо перад прыездам валанцёраў на кухні зрабілі «еўрарамонт», замянілі абсталяванне. Кухараць падчас работы змены нямецкі і беларускі кухары.

Валанцёрская змена доўжыцца 21 дзень. Працуюць з 8 раніцы да 17 гадзін. Увечары праводзяць розныя мерапрыемствы, па выхадных — экскурсіі па Беларусі: Мінск, Хатынь, Віцебск, Нарач...

80 працэнтаў валанцёраў прыязджаюць з года ў год, бо ім вельмі ў нас падабаецца. Гэта людзі ва ўзросце ад 16 і да 80(!) гадоў, прадстаўнікі розных прафесій.

...Адказныя асобы з Міністэрства прыродных рэсурсаў, якія наведалі паселішча перасяленцаў у Старым Лепелі, прызналіся, што самы вялікі дэфіцыт у нашай краіне — не грошы, а цікавыя ініцыятывы. Былі б апошнія — знойдуцца і крыніцы для фінансавання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.

Лепельскі раён.

ПАКВАТЭРНЫ ЎЛІК ЦЯПЛА — НЕ ПРАБЛЕМА

Рабіць разлікі за фактычна спажытую ў кватэрах цеплаэнергію можа любы жылы дом. калі такое жаданне выкажуць не менш за 75% жыльцоў.

Як патлумачылі ў дзяржаўным аб'яднанні «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка», з 2010 года кватэры ў новабудоўлях аснашчаюць лічыльнікамі цяпла. Гэта магчыма толькі пры гарызантальнай сістэме ацяплення, якая прадугледжваецца праектам. Аднак умовы для рэгулявання тэмпературы можна стварыць таксама ў дамах з традыцыйнай вертыкальнай разводкай. Для гэтага на радыятары манціруюць тэрмарэгулятары (тэрмастатычныя вентылі) і размеркавальнікі цяпла. Гэтае абсталяванне ўстанаўліваюць пры капрамонце. Пакуль выдаткі закладваюцца ў каштарыс, але, магчыма, за прыборы ўліку жыльцам давядзецца даплачваць асобна.

Пры адсутнасці прыбораў уліку гаспадары кватэр могуць набыць іх за ўласныя сродкі і аплаціць работу па мантажы. Сёння для 2-пакаёвай кватэры з вертыкальнай сістэмай ацяплення гэта абыдзецца ў 1 335 000 — 1 820 000 рублёў у залежнасці ад тыпу размеркавальніка (выпарны або электронны). Пасля трэба будзе заключыць дагавор на тэхнічнае абслугоўванне і правядзенне разлікаў па індывідуальных прыборах са спецыялізаванай арганізацыяй.

«Мінск-Навіны».

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Многоквартирный жилой дом по генплану №12А, не относящийся к домам повышенной комфортности, со встроенными помещениями по проспекту газеты «Правда» в г. Минске

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

Застройщик – закрытое акционерное общество «Инвест-Систем».

Юридический (почтовый) адрес – 220040, г. Минск, ул. Л.Беды, 8.

Режим работы – понедельник-четверг с 9.00 до 18.00, пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 13.50.

ЗАО «Инвест-Систем» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 4 сентября 2000 года за №100649060.

В течение трех предшествующих лет ЗАО «Инвест-Систем», как застройщиком, построены следующие объекты:

в 2008 году: 9-этажный, 128-квартирный ж/д. со встроенными помещениями №80 по пр. Дзержинского;

в 2009 году: 9-этажный, 35-квартирный ж/д. №3а по пр. Газеты «Правда»:

в 2011 году: 9-этажный, 120-квартирный ж/д. № 78 по пр. Дзержинского и 9-этажный, 125-квартирный жилой дом № 74 по пр. Дзержинского.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

Цель строительства – исполнение проекта по договору на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), заключенному с Минским горисполкомом 05.07.2011г. № 301Д. Строительство жилого дома осуществляется в один этап без выделения пусковых комплексов.

По проектной документации получены заключения и согласования:

комитета архитектуры и градостроительства Минского горисполкома (№12-08/167М от 07.12.2009г,); Минского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды (№ 02 -6/456 от 31.03.2010г.); Минского городского управления МЧС (№ 47/08 -09/655а от 23.03.2010г.); Департамента по авиации Министерства транспорта и коммуникаций (письмо №4-20-2218 от 11.05.2010); РУП "Главгосстройэкспертиза " (№2244 -5/9 от 03.05.2010г., № 517-15/11 от 20.07.2011г., № 45-15/12 от 10.02.2012г.).

Площадка строительства жилого дома расположена вдоль пр. Газеты «Правда». Жилой дом представляет собой 25-этажное здание (жилых 23 этажа). В жилом доме на первом этаже размещаются три группы помещений административно-офисного назначения с обособленными входными группами, электрощитовая, мусоросборная камера и помещение уборочного инвентаря. Здание запроектировано с техподпольем и теплым техническим чердаком. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас, несущие монолитные перекрытия. Наружные стены из блоков ячеистого бетона. Межкомнатные перегородки – из мелкоштучных материалов и блоков. Кровля – плоская с внутренним водостоком. Фундаменты свайные. Лоджии и балконы остеклены. Жилой дом оборудован двумя пассажирским лифтами и одним грузовым, мусоропроводом.

Число этажей – 25, из них 23 этажа – жилые, число секций – 1, количество квартир – 115, в том числе: однокомнатных – 23, двухкомнатных – 69, трехкомнатных – 23, Общая площадь жилых помещений – 6982,82 кв.м. Жилые помещения и помещение общественно-административного назначения без внутренней чистовой отделки.

Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, а также с юридическими лицами предлагаются 15 квартир.

Базовая цена 1 кв.м. общей площади жилого помещения при внесении первоначального взноса в размере 100% стоимости квартиры в течение десяти дней с момента заключения договора составляет:

10 800 000 белорусских рублей за 1 кв.м. в трехкомнатной квартире;

11 000 000 белорусских рублей за 1 кв.м. в однокомнатной и двухкомнатной квартире;

Базовая цена 1 кв.м. общей жилого помещения при внесении 50% стоимости квартиры составляет:

11 000 000 белорусских рублей за 1 кв.м. в трехкомнатной квартире;

11 300 000 белорусских рублей за 1 кв.м. в двухкомнатной квартире и однокомнатной квартире.

Заявленные цены действительны до 31 марта 2013 года. Ежемесячно, начиная с 1 марта 2013 года, указанные цены подлежат индексации.

Разрешение на строительство объекта и земельный участок под застройку предоставлены в соответствие с решением Минского горисполкома от 14 июля 2011 г. №1963, а также актами выбора земельного участка от 12.02.2008г., от 15.03.2009г. и от 21.04.2009г., утвержденными председателем Минского горисполкома соответственно 19.02.2008г., 26.03.2009г. и 11.05.2009г.

Проектом предусмотрено благоустройство прилегающей территории, в том числе, устройство детских игровых площадок, оборудованной малыми формами, площадки для отдыха населения, хозяйственных площадок, гостевой автостоянки, пешеходных тротуаров, озеленение путем посадки декоративных деревьев и кустарников и устройства газона.

После утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию жилого дома и связанных с ним иных объектов недвижимости дольщикам будут переданы указанные в настоящей проектной декларации квартиры и помещение общественно-административного назначения.

В состав общего имущества жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности после ввода в эксплуатацию жилого дома (объекта) и передачи объектов долевого строительства дольщикам, входят места общего пользования жилого дома, чердачное и технические помещения.

Срок ввода в эксплуатацию строящегося объекта в соответствии с ПСД – июль 2013 года.

Договор строительного подряда от 18 октября 2011г. №34 -1 /26 -2011 заключен с ОАО «Строительный трест №4».

Указанное в настоящей проектной декларации предложение считать действительным по 31 марта 2013 г., либо до опубликования новой проектной декларации на данный объект.

■ Спорт

Знерваваная вікторыя

Беларуская тэнісістка прабілася ў фінал «Australia Open», але яе паводзіны падчас гульні з амерыканкай Слоўн Стывенс выклікалі здзіўленне і непаразуменне ў тэнісістаў і журналістаў.

Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі, які гэтымі днямі прымае Мельбурн, складваецца для Вікторыі даволі нядрэнна. Перад паўфінальным паядынкам з амерыканкай Стывенс яна пераканаўча перамагла 5 апанентак, але менавіта сустрэча з 19-гадовай Слоўн стала для першай ракеткі свету самай цяжкай на прадстаўнічым турніры. І не толькі ў гульнявым складніку.

Таленавітая амерыканка ўжо здзівіла тэнісны свет у 1/4 фіналу, калі ў напружанай барацьбе перайграла Сірэну Уільямс. Але паўфінальны «кантакт» на блакітным корце паміж Азаранкай і Стывенс не быў напружаным, драматычным для балельшчыкаў. Выніковы лік 6:1, 6:4 сведчыць пра перавагу ў класе. Толькі дасціпныя спецыялісты ўсё роўна знайшлі да чаго прычапіцца. У вырашальнай партыі Азаранка перамагала з лікам 5:3. Праўда, не рэалізавала 5 матчболаў, а пасля накінула на плечы ручнік і пакінула корт на медыцынскі перапынак, які працягваўся больш, чым звычайна. Азаранка на корт вярнулася, перамагла, а пасля прызналася, што ў пэўны момант проста знервавалася. «Вы ведаеце, я не магла дыхаць, — так тлумачыць сітуацыю тэнісістка амерыканскаму каналу ESPN. — Я адчувала боль у грудзях. І мне неабходна было пераканацца ў тым, што ўсё добра, бо я сапраўды не магла дыхаць». Нягледзячы на гэта, цікаўныя ўсё роўна здзіўляюцца, чаму Азаранка пакінула корт.

Фота БЕЛТА.

— Яна крыху знервавалася і з-за гэтага пакінула корт, — кажа каментатар Патрык Макінрой. — Неверагодна. Ці вы жартуеце? Сапраўдная карыкатура.

Мэт Кронін з выдання «Tennis Reporters» пайшоў яшчэ далей: ён знайшоў у правілах пункт, у якім прапісана, што Азаранку маглі дыскваліфікаваць з-за таго, што ўзяла перапынак не з-за хваробы ці траўмы. А вось вядомы ў мінулым расійскі тэнісіст Яўген Кафельнікаў назваў падобныя паводзіны тэнісісткі махлярствам.

Безумоўна, сітуацыя з тых, у якой не ведаеш, як усё адбылося насамрэч. Але ў любым выпадку здзіўляе татальна адмоўная рэакцыя на доўгі перапынак Азаранкі. А можа, доктар і сапраўды проста вельмі доўга аказваў ёй дапамогу? Тым больш, справа тычыцца першай ракеткі свету, лідара, а не выпадковай дзяўчыны, якой у пэўны момант проста пашанцавала. У фінальнай сустрэчы Вікторыя сустрэнецца з кітаянкай Лі На, шостым нумарам рэйтынгу. Гісторыя супрацьстаяння кітаянкі і беларускі даволі пазітыўная для Азаранкі. Летась беларуска тройчы перамагала азіятку. Галоўнае, каб псіхалагічная атака нядобразычліўцаў не ператварылася ў псіхалагічна цяжкі фінал. Поспехаў, Вікторыя!

Тарас ШЧЫРЫ

■

КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Логойского района Минской области

27 февраля 2013 года 11.00

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Расходы по подготовке документов	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	аг. Камено, участок № 1, 623282704101000176	0,2500	4 051 251	8 000 000	1 600 000
2	аг. Камено, участок № 3, 623282704101000185	0,2500	4 280 797	8 000 000	1 600 000
3	д. Середнее, участок № 3 623282710601000013	0,1528	4 280 797	4 500 000	900 000
4	д. Середнее, участок № 4 623282710601000014	0,1526	4 280 797	4 500 000	900 000

Задаток перечисляется на р/с № 3600619071109, ЦБУ № 611, филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, г. Логойска, УНП 600181630, ОКПО 04431547600, код платежа 4901 Каменский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится 27 февраля 2013 года в 11.00 по адресу: Минская область, Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, 7 А.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 11.00 22 февраля 2013 года.

Контактные телефоны:

(8 01774) 72 3 35, 72 3 81, 72 3 43, (+ 375 29) 170 02 61

Наш сайт в интернете logoysk.gov.by.

■ Запрашальнік

САБАКІ ДА РАЎБІЧ ДАВЯЗУЦЬ

На спаборніцтвы па ездавым спорце некаторых удзельнікаў прывязуць бацькі, а адзін прыедзе на інваліднай калясцы

«Дабірацца на сабаках» — для спартсменаў, якія займаюцца ездавым спортам, і аматараў паўночных ездавых сабак гэты выраз зусім не фігуральны. Дый для многіх беларусаў зімовыя гонкі на сабачых запрэжках перасталі быць экзотыкай дзякуючы міжнародным спаборніцтвам па ездавым спорце «Завіруха», што адбудуцца сёлета ўжо трэці раз.

Паводле слоў ідэйнага натхняльніка чэмпіянату, старшыні Клуба паўночных ездавых сабак Вольгі Ведзянеевай, 26 і 27 студзеня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы» чакаецца больш за 130 спартсменаў з Беларусі, Расіі, Літвы і Латвіі, а таксама каля 8000 гасцей. Далей за ўсіх ехаць давядзецца спартсмену ажно з Чукоткі — з Анадыра. «Акрамя дарослых спартсменаў, да ўдзелу заяўлены і дзеці — некалькі маленькіх спартсменаў ва ўзроста-

Даведка «Звязды»

На сёння Міжнародная кіналагічная федэрацыя вылучае 4 пароды ездавых сабак: хаскі, маламуты, самаеды, грэнландскія ездавыя. Усе астатнія лічацца так званымі метысамі.

Лічыцца, што «правільны» ездавы сабака мусіць важыць 35-45 кг і дасягаць росту 55-65 см у карку.

Да зімовых відаў ездавога спорту належаць:скіджорынг (лыжная гонка з 1-2 сабакамі), пулка (гонкі лыжніка з 1-4 сабакамі, запрэжанымі ў адмысловыя маленькія санкі — пулку), запрэжка (гонкі нартаў, запрэжаных некалькімі сабакамі, якімі кіруе спартсмен-каюр).

Існуюць таксама бясснежныя віды спорту, або драйлэнд, куды ўваходзяць канікрос (бег з сабакам), байкджорынг (буксіроўка сабакам веласіпеда са спартсменам), картынг (буксіроўка сабакамі адмысловага вазка — карта) і скутарынг (гонкі на спартыўных самакатах).

вай катэгорыі да 7 гадоў будуць удзельнічаць у пазаконкурсных заездах, яшчэ некалькім паўнапраўным удзельнікам спаборніцтваў — ад 7 да 13 гадоў. Самаму сталаму нашаму гоншчыку — 71 год, і гэта, лічу, сведчыць аб тым, што ездавы спорт падуладны кожнаму, — расказала арганізатар. — Акрамя таго, упершыню на «Завіруху-2013» прыедзе спецыяльны госць з Расіі, інвалід-калясачнік Дзмітрый Волкаў з Цвяры, які нароўні з усімі, толькі з дапамогай лыжных палак, на адмыслова выраблены нартах жадае прайсці нашу дастаткова складаную трасу».

Хоць спаборніцтвы і трэцяя па ліку, але сёлета на іх шмат што адбудзецца ўпершыню. Пачынаючы з найбольш грунтоўнай падзеі — пераезду з загараднага клуба «Фестывальны» на Валожыншчыне на праспорную алімпійскую пляцоўку Раўбіч. Арганізатары тлумачаць гэта проста: мерапрыемства разрастаецца, вось і атрымалася «каралеўства малаватае, разгарнуцца няма дзе». Таксама ўпершыню сёлета адчуць азарт спаборніцтваў і падтрымаць удзельнікаў змогуць нават тыя, хто будзе знаходзіцца ад трасы далекавата ці нават не зможа прысутнічаць асабіста — дзякуючы тэлевізійнай (на вялікім экране) і анлайн-трансляцыі «Завірухі-2013». Упершыню сумаваць не давядзецца нават самым юным наведнікам спаборніцтваў — для зусім маленькіх будзе працаваць адмысловы пакой «Маці і дзіця», дзе малых можна будзе пераадзець і пакарміць, а для крыху старэйшых дзетак ладзяць пакой для гульняў і адпачынку. Дарослых жа чакае насычаная праграма — не толькі ўласна заезды з 1, 2, 4 і 6 сабакамі, але таксама эстафета і слалам на нартах, зборка запрэжкі на хуткасць, конкурсы на самага моцнага, самага прыгожага, самага разумнага і паслухмянага сабаку. Плюс відовішчная мультыгонка «8 колаў» з выкарыстаннем прынад ад лыжаў да веласіпеда, сямейныя гонкі на санках для дзетак з бацькамі (прыз пераможцу — цёплыя шкарпэткі), яваровачны лабірынт «Павуцінне», Кірмаш майстроў, стральба з лука і арбалета, сярэднявечныя шатландскія гульні і шмат чаго яшчэ... «Ва ўсім свеце гонкі па ездавым спорце традыцыйна праходзяць як гэткі міжсабойчык для спартсменаў, а ў нас атрымаўся з самай першай «Завірухі», хутчэй, фестываль актыўнага ладу жыцця», — не без гонару адзначае суарганізатар спаборніцтваў Алег Гапановіч.

Лыжаролерная траса ў Раўбічах спецыяльна падрыхтавана да ездавых спаборніцтваў, а пэўнае абсталяванне, напрыклад, сістэму аўтаматызаванага хронаметражу і фотафінішныя ўстаноўкі, пазычыла Федэрацыя біятлону. «Нават калі да выхадных пройдуць моцныя снегапады, як на мінулым тыдні, і «Завіруха» апраўдае сваю назву на 100%, мы сумесна з мясцовымі ўладамі пастараемся зрабіць усё магчымае, каб непагадзь не сапсавала настрой удзельнікам і гледачам», — запэўніваюць арганізатары.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

На заметку

Квіткі на адзін дзень спаборніцтваў, набытыя загадзя, абыдуцца дарослым у 30 тысяч беларускіх рублёў, на два дні — у 45 тысяч. Непасрэдна ў дні гонкі яны падрастуць у цане на 5 тысяч. Дарэчы, для дзяцей ростам да 140 см уваход бясплатны.

Гаспадары, якія прывязуць з сабой на мерапрыемства чатырохногіх сяброў, мусяць мець пры сабе ветэрынарныя пашпарты гадаванцаў і трымаць тых строга на павадку.

Прыемная дэталь для аўтааматараў: паркоўка падчас правядзення «Завірухі-2013» будзе бясплатнай, а колькасць парковачных месцаў — максімальнай. Тым не менш арганізатары просяць аўтамабілістаў з разуменнем і цярпеннем ставіцца адзін да аднаго і да дарожнай сітуацыі, якая можа скласціся пры вялікай колькасці гасцей.



■ Інфарм-укол

МЕНІНГІТ НАГАДВАЕ ПРАСТУДУ

Адной з самых цяжкіх інфекцый дзіцячага ўзросту з'яўляецца менінгакокавая інфекцыя. Найбольш часта ад яе пакутуюць дзеці ва ўзросце да 14 гадоў, з іх асноўная колькасць — малыя першых двух гадоў жыцця.

Як паведамляюць у **аддзяленні імунапрафілактыкі Гомельскага абласнога цэнтра грамадскага здароўя,** менінгакокавая інфекцыя вельмі лёгка распаўсюджваецца — пры кашлі, чханні, размове, досыць цесных і працяглых кантактах. Пачатковыя праявы захворвання нагадваюць прастуду або грып. Прычым хвароба можа развівацца ў лічаныя гадзіны і нават хвіліны. Наогул узбуджальнік менінгакокавай інфекцыі пастаянна цыркулюе сярод дарослага насельніцтва, але найбольшую эпідэмічную небяспеку для навакольных уяўляюць бактэрыяносьбіты. Лічыцца, што на 1 хворага прыпадае 1200 бактэрыяносьбітаў. Часцей за ўсё носьбітамі з'яўляюцца дарослыя, якія нават не падазраюць аб гэтым, а вось хварэюць пераважна дзеці.

Найбольш распаўсюджанай формай інфекцыі з'яўляецца назафарынгіт, калі запаляецца задняя сценка глоткі, нязначна павышаецца тэмпература, з'яўляецца галаўны боль, насмарк. На гэтым этапе пацыентам часцей ставіцца дыягназ «вострае рэспіраторнае захворванне». Аднак ёсць і іншыя формы хваробы. Так, дзіця можа легчы спаць абсалютна здаровым, а ноччу стаць неспакойным, пакутаваць ад моцнага галаўнога болю, які не знімаецца звычайнымі сродкамі абязбольвання. На працягу гадзіны звычайна ўзнімаецца тэмпература да 39-40 градусаў, праз 5-6 гадзін пачынае ванітаваць. Самы жорсткі сімптом, на які трэба звярнуць увагу, — сып на руках, ягадзіцах, бакавых паверхнях тулава. І менавіта пры яе наяўнасці трэба паўторна выклікаць доктара, паколькі першы дыягназ, да сыпу, быў «вострае рэспіраторнае захворванне». Пры першых жа характэрных сімптомах неабходна тэрмінова выклікаць «хуткую». Да прыезду «хуткай» хворага ізалююць і забяспечваюць яму спакой і догляд. Не адмаўляйцеся ад прапанаванай хвораму шпіталізацыі.

Як абараніцца ад менінгакокавай інфекцыі?

1. Каб не захварэць і не заразіць навакольных, неабходна пазбаўляцца хранічных хвароб насаглоткі — фарынгіту, танзіліту, ларынгіту. У выпадку прастудных праяў бацькі могуць з'явіцца крыніцай захворвання для свайго дзіцяці, таму неабходна карыстацца марлевымі павязкамі.

2. Рэкамендуецца болей гуляць з дзіцем на свежым паветры.

3. Харчаванне павінна быць збалансаваным, з вітамінамі і мікраэлементамі.

4. Абавязковыя заняткі фізкультурай, загартоўванне.

5. Пакоі трэба рэгулярна праветрываць, рабіць вільготныя прыборкі.

ЧЫМ ГОРШ З БАЦЬКАМІ, ТЫМ «БЛІЖЭЙ» АЛКАГОЛЬ

Нават невялікія дозы алкаголю згубна ўплываюць на мозг чалавека, які расце і развіваецца. Наогул лічыцца, што развіццю алкагалізму ў маладым узросце спрыяюць «піцейныя» звычкі, адсутнасць належнага выхавання, дрэнныя прыклады, імкненне прыпадабняцца да старэйшых, канфлікт з грамадскімі нормамі і некаторыя інш.

Даследчыкі ўстанавілі, што на алкагалізацыю дзяцей істотны ўплыў аказваюць алкагольныя паводзіны маці і бацькі. Уплыў жа равеснікаў узмацняецца пры адсутнасці бацькоўскага кантролю. Наогул безнаглядныя дзеці, тыя, чые бацькі не знаходзяць часу для кантакту з імі, найчасцей прыкладаюцца да чаркі. Ранняй алкагалізацыяй лічыцца знаёмства з алкаголем да 16 гадоў. Пра падлеткавы алкагалізм варта гаварыць пры наяўнасці яго першых прыкмет да 18 гадоў. Па меры таго, як дзеці сталеюць, павялічваецца частата ўжывання гарэлкі.

Паводле слоў **інструктара-валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірыны ШЫМАНСКАЙ,** уплыў алкаголю на арганізм чалавека даўно і падрабязна вывучаны. Вядома, напрыклад, што алкаголь прыводзіць да значных змяненняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, паступоваа фарміравання таксічнай энцэфалапатыі. Парушаюцца ўвага, мысленне, памяць, працаздольнасць. З жыцця паступова выціскаецца ўсё, акрамя самых нескладаных і прымітыўных патрэб. Фарміруюцца пэўныя ўстаноўкі, спосабы ўспрыняцця рэчаіснасці. Гэта, скажам, установка на хуткае задавальненне патрэб пры малых намаганнях, установка на пасіўныя спосабы абароны пры сустрэчы з цяжкасцямі, установка на пазбяганне адказнасці за свае ўчынкі і інш.

У Цэнтры «Поспех», дружалюбным да падлеткаў (г. Мінск, вул. Герасіменкі, 22/2) — могуць пракансультаваць і аказаць кваліфікаваную ананімную дапамогу. Тэл. 242 15 73.

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Віцебск-2013

УЖО РЫХТУЕМСЯ ДА «БАЗАРУ»

У дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўжо ідзе прыём заявак на ўдзел у XXII Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2013» і XI Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе.

— Заяўкі прымаюцца да 22 сакавіка. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца выканаўцы эстраднай песні з розных краін свету, якія маюць вопыт канцэртных выступленняў і заявілі пра сябе сваімі поспехамі ў нацыянальных музычных конкурсах і фестывалях, маюць рэкамендацыі ад дзяржаўных міністэрстваў і ведамстваў культуры (абавязкова для краін СНД), прадзюсарскіх цэнтраў, музычных студый, музычных тэле-, радыёпраграм, дырэкцый музычных фестываляў і конкурсаў, — паведамілі ў дырэкцыі фестывалю. — Узрост удзельнікаў XXII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2013» ад 18 да 31 года ўключна.

Вырашальнай для ўзроставага абмежавання з'яўляецца дата нараджэння (не раней за 1 ліпеня 1982 г.). Узрост удзельнікаў XI Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2013» — ад 7 да 12 гадоў.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе ад грамадзян Беларусі прымаюцца ў Міністэрстве культуры.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Даты — Падзеі — Людзі

1101 год — нарадзілася Еўфрасіння Полацкая, князёўна, асветніца, ігумення манастыра Святога Спаса ў Полацку. Унучка полацкага князя Усяслава Брачыславіча (Чарадзея). Пастрыгшыся ў манашкі, пасялілася ў келлі Полацкага Сафійскага сабора. У храмавым скрыпторыі перапісвала кнігі, магчыма, складала летапісы, перакладала з грэчаскай мовы. Сабрала манастырскую бібліятэку, арганізавала невялікую школу, дзе навучала грамаце малых дзяўчынак. Каля 1160 года ў Полацку на свае сродкі пабудавала дзве царквы: Святога Спаса (цяпер Спаса-Праабражэнская) і Святой Багародзіцы, куды яе стараннямі была прывезена копія славутай візантыйскай іконы «Маці Божая Адзігітрыя Эфеская». У 1161 годзе на замову Еўфрасінні полацкі майстар Лазар Богша для царквы Святога Спаса вырабіў напрастольны 6-канцовы крыж, упрыгожаны каштоўнымі камянямі, пасля названы яе імем. Заснавала ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры, якія сталі цэнтрам асветы ў Полацкім княстве. Пры кляштарах працавалі так званыя вучыльні (тут вывучаліся чытанню, пісьму), бібліятэкі, скрыпторыі, прытулкі, іканапісныя і ювелірныя майстэрні. У 1167 годзе здзейсніла паломніцтва ў Палесціну, у тым жа годзе памерла ў Іерусаліме, была пахавана ў манастыры святога Феадосія. У 1187 годзе яе астанкі перапахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры, у 1910-м перавезены ў Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр. У 1984 годзе Еўфрасіння Полацкая прылічана да Сабору Беларускіх Святых.



1938 год — 75 гадоў сёння споўнілася б Уладзіміру Высоцкаму, вядомаму паэту, аўтару-выканаўцу песень, акцёру, аўтару празаічных твораў. Уладзімір Сямёнавіч выканаў дзясяткі роляў у тэатры, у тым ліку Гамлета («Гамлет» паводле У. Шэкспіра), Галілея («Жыццё Галілея» Б. Брэхта), Лапахіна («Вішнёвы сад» А. Чэхава). Найбольш характэрнымі работамі ў кінематографе з'яўляюцца яго ролі ў фільмах «Месца сустрэчы змяніць нельга», «Маленькія трагедыі», «Інтэрвенцыя», «Гаспадар тайгі», «Вертыкаль», «Служылі два таварышы», «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў», «Кароткія сустрэчы», «Дрэнны добры чалавек». Уладзімір Высоцкі ўвайшоў у гісторыю як аўтар-выканаўца сваіх песень пад акустычную сяміструнную «рускую» гітару. Род Высоцкага паходзіць з мястэчка Сялец Пружанскага павета Гродзенскай губерні (цяпер — Брэсцкая вобласць). Прозвішча, верагодна, звязана з назвай горада Высокае, што знаходзіцца недалёка ад Камянца на Брэстчыне.

1955 год — нарадзіўся (вёска Кузьмічы Дзятлаўскага раёна) Аляксандр Іванавіч Лакотка, беларускі архітэктар, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Працаваў у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, з 1995 года — у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі (з 2004-га — дырэктар). Аўтар больш як 200 навуковых прац у галіне тэорыі і гісторыі архітэктуры, аховы і рэстаўрацыі архітэктурнай спадчыны. Стварыў навуковую канцэпцыю гістарычнага феномена беларускай архітэктуры як вынік сінтэзу будаўнічага мастацтва Усходу і Захаду Еўропы. Выявіў вялікую колькасць помнікаў народнага дойлідства, што паслужыла асновай для стварэння з яго удзелам музея народнай архітэктуры пад адкрытым небам.

Было сказана

Андрэй ВОЛЯН (пасля 1530-1610), палітычны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, ідэолаг Рэфармацыі, філосаф:

«Падпарадкоўвайце свае жаданні загадам розуму».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.07	17.37	8.30
Віцебск	9.02	17.21	8.19
Магілёў	8.57	17.27	8.30
Гомель	8.48	17.30	8.42
Гродна	9.22	17.53	8.31
Брэст	9.16	18.00	8.44

Месяц

Першая квадра 27 студзеня. Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Таццяны, Пятра, Савы.*
К. *Ірэны, Таццяны, Эльвіры, Генрыха, Мілаша, Паўла, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Дзед Мароз на Новы год прынёс дзіцяці набор юнага доктара. І ў нашай коткі адразу пачалося новае жыццё, поўнае цяжкавылечных хвароб.

Едуць у аўтобусе на рыбалку трое — дзед, бацька і ўнук. Заходзіць дзяўчына ў панчохах у клетку.

Думкі.

Унук: «Якая чыкса клёвая!»

Бацька: «Усе грошы з бацькі на шмоткі, пэўна, выцягнула...»

Дзед: «Халера! Падхватнік забылі-ся!..»

Выхадны: прачнуўся, паеў, стаміўся.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 25.903. Індэкс 63850. Зак. № 385.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 студзеня 2013 года.